**23.** Словы *завал – заваліна* з’яўляюцца … .

*1) сінонімамі; 2) антонімамі; 3) амонімамі; 4) паронімамі.*

Выберыце правільны варыянт.

**А)** няма правільнага варыянта. **Б)** 1. **В)** 2. **Г)** 3. **Д)** 4.

**24.** У якіх словах з дадзеных неабходна напісаць на месцы пропуску ***ь*** (мяккі знак)?

*1) він..етка; 2) сен..ярыта; 3) кан..ён.*

**А)** усе прыклады. **Б)** няма патрэбных прыкладаў.
**В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 3.

**25.** Якія словы з дадзеных можна падзяліць для пераносу?

*1) двое; 2) узмор’е; 3) шчаўе; 4) шыйце*; *5) сям’я.*

**А)** усе прыклады. **Б)** няма патрэбных прыкладаў.
**В)** 1, 3. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 5.

**26.** Выберыце з дадзеных назоўнікі мужчынскага роду:

*1) шаль; 2) фальш; 3) жаль.*

**А)** усе прыклады. **Б)** няма патрэбных прыкладаў.
**В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 3.

**27.** У даўнія часы ў гэты дзень тыдня катэгарычна забаранялася стрыгчы пазногці. А калі была доўгая засуха, то менавіта ў гэты дзень жанчыны выконвалі своеасаблівы магічна-ахоўны абрад прадзення ручніка-абыдзённіка. Пра які дзень тыдня ідзе размова?

**А)** панядзелак. **Б)** аўторак. **В)** серада. **Г)** чацвер. **Д)** пятніца.

**28.** Як называлася аповесць Міхася Чарота, на аснове якой быў створаны першы беларускі мастацкі фільм “Лясная быль”?

**А)** “Завіруха”. **Б)** “На Купалле”. **В)** “Сон на балоце”.
**Г)** “Свінапас”. **Д)** “Мікітаў лапаць”.

**29.** Старажытны музычны інструмент, які імітуе шум дажджу, называецца …

**А)** жалейка. **Б)** гуслі. **В)** дудка. **Г)** чарот. **Д)** хмара.

**30.** Хто з беларускіх паэтаў сказаў: *“Усё пакінуць след павінна”*?

**А)** М. Танк. **Б)** П. Панчанка. **В)** Р. Барадулін.
**Г)** П. Броўка. **Д)** А. Куляшоў.

Конкурс арганізаваны і праводзіцца Грамадскім аб’яднаннем «Беларуская асацыяцыя «Конкурс» сумесна з Акадэміяй паслядыпломнай адукацыі пад эгідай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.

220045, г. Мінск, вул. Яна Чачота, 16
тэл. (017) 372 36 17, 372 36 23
e-mail: info@bakonkurs.by http://www.bakonkurs.by/

ГА «БА «Конкурс». Заказ 16. Тыраж 13500 экз. г. Мінск. 2015 г.

# Конкурс па беларускай мове «БУСЛІК-2015»

*Чацвер, 19 лютага 2015 года*

- працягласць работы над заданнем 1 гадзіна 15 хвілін;
- карыстацца падручнікамі, канспектамі, справачнай літаратурай і электроннымі сродкамі забараняецца;
- кожны правільны адказ адзначаецца трыма, чатырма ці пяццю баламі; колькасць балаў, якія атрымлівае ўдзельнік, адказваючы на пытанне правільна, вызначаецца складанасцю пытання (10 лягчэйшых пытанняў – па 3 балы, 10 найбольш складаных – па 5 балаў, астатнія 10 – па 4 балы); складанасць пытання вызначаецца па колькасці ўдзельнікаў, якія правільна на яго адказалі;
- няправільны адказ адзначаецца чвэрцю балаў, прадугледжаных за дадзенае пытанне, і залічваецца са знакам «мінус», у той час, як не даўшы адказу, удзельнік захоўвае раней набраныя балы;
- на кожнае пытанне маецца толькі адзін правільны адказ;
- на старце ўдзельнік атрымлівае авансам 30 балаў;
- максімальная колькасць балаў, якую можа атрымаць удзельнік конкурсу, – 150, аднак аўтары задання не прадугледжваюць яго поўнага выканання ўдзельнікамі. У заданне гульні-конкурсу ўключаны пытанні, веды пра якія не прадугледжаны школьнай праграмай;
- самастойная і сумленная работа над заданнем – галоўнае патрабаванне арганізатараў да ўдзельнікаў конкурсу; пры парушэнні гэтых патрабаванняў удзельнікі могуць быць дыскваліфікаваны;
- пасля заканчэння конкурсу лісток з заданнем застаецца ўдзельніку;
- вынікі ўдзельнікаў размяшчаюцца на сайце http://www.bakonkurs.by/ праз 1-1,5 месяцы пасля правядзення конкурсу.

## Заданне для вучняў 9 класа

**1.** Якія словы з дадзеных не з’яўляюцца назвамі грыбоў?

*1) бабка; 2) махавік; 3) порхаўка.*

**А)** усе словы. **Б)** няма такіх слоў. **В)** 1. **Г)** 2. **Д)** 3.

**2.** Адгадайце народную загадку:

*Складзеш – клін, развернеш – блін.*

**А)** аркуш паперы. **Б)** палатка. **В)** плашч. **Г)** парасон. **Д)** шляпа.

**3.** Да якога жанру адносіцца твор Янкі Купалы “Паўлінка”?

**А)** паданне. **Б)** раман. **В)** паэма. **Г)** драма. **Д)** камедыя.

**4.** Пра каго з герояў паэмы “Новая зямля” Якуб Колас напісаў:

*А вочы шэры, невялічкі,*
*Глядзяць прыветна, як сунічкі,*
*Але раптоўна і адразу*
*Не расчытаеш іх выразу…?*

**А)** пра Ганну. **Б)** пра Міхала. **В)** пра Антося. **Г)** пра Кастуся. **Д)** пра Ярся.

**5.** Выберыце правільна запісаныя словы:

*1) медаль; 2) цень; 3) палынь; 4) пыль.*

**А)** усе прыклады. **Б)** няма патрэбных прыкладаў. **В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

**6.** Здаўна існаваў народны звычай: перад вяселлем спецыяльна запрошаныя жанчыны павінны былі спячы, выконваючы пэўны абрад, самую галоўную страву вясельнага стала. Што пяклі жанчыны?
**А)** бліны. **Б)** аладкі. **В)** хлеб. **Г)** каравай. **Д)** булкі.

**7.** Вызначце з дадзеных аднасастаўныя сказы.
*1) Дзень сонечны, ясны.* *2) Незыбыўная сустрэча альпіністаў.*
*3) Не рабі ліхога і не бойся нікога.* *4) Пад самы вечар пачаўся крыгаход.*
**А)** усе прыклады. **Б)** няма патрэбных прыкладаў. **В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

**8.** Якое(-ія) лексічнае(-ыя) значэнне(-і) адпавядае(-юць) назоўніку *эстэтыка*?
*1) 'навука аб прыгожым';*
*2) 'навука пра мараль як адну з формаў грамадскай свядомасці';*
*3) 'сістэма чыіх-небудзь поглядаў на мастацтва';*
*4) 'нормы паводзін, мараль якога-небудзь класа, арганізацыі, прафесіі'.*
**А)** няма патрэбных варыянтаў. **Б)** 1, 3. **В)** 2. **Г)** 3. **Д)** 2, 4.

**9.** Лексічнае значэнне *'адметны, не такі, як усе; больш значны, чым звычайна'* мае прыметнік … .
**А)** асабісты. **Б)** асабовы. **В)** асаблівы. **Г)** асобны. **Д)** асноўны.

**10.** Вучні выпісвалі назоўнікі, якія ў родным склоне маюць канчатак -а. Пятрусь выпісаў словы *косінус, камбінат, метр*.
Васіль – *гром, сшытак, брат*.
Ігнат – *кілаграм, лес, аловак*.
Хто правільна выканаў заданне?
**А)** усе правільныя адказы. **Б)** няма правільных адказаў.
**В)** Пятрусь. **Г)** Васіль. **Д)** Ігнат.

**11.** У якіх словах на месцы пропуску напішаце літару ***в***?
*1) на..огул; 2) ..охра; 3) ..одум; 4) ..устрыца; 5) ..окаць.*
**А)** усе прыклады. **Б)** няма патрэбных прыкладаў. **В)** 1, 3. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 5.

**12.** Выберыце з дадзеных правільна запісаныя лічэбнікі:
*1) пяць; 2) семь; 3) дзевяць; 4) восемь; 5) двадцаць.*
**А)** усе прыклады. **Б)** няма патрэбных прыкладаў. **В)** 1, 3. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 5.

**13.** Які з дадзеных дзеясловаў у форме 2-ой асобы множнага ліку цяперашняга ці будучага простага часу мае канчатак ***-еце***?
*1) глянуць; 2) круціць; 3) махнуць.*
**А)** усе прыклады. **Б)** няма патрэбных прыкладаў. **В)** 1. **Г)** 2. **Д)** 3.

**14.** Выберыце з дадзеных словы, у якіх ёсць [с']:
*1) касьба; 2) подпіс; 3) мазь; 4) сцежка.*
**А)** усе прыклады. **Б)** няма патрэбных прыкладаў. **В)** 1, 3. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

**15.** Якім членам сказа з'яўляецца выдзеленае ў сказе слова?
Да возера яшчэ <u>далёка</u>.
**А)** дзейнікам. **Б)** выказнікам. **В)** азначэннем.
**Г)** дапаўненнем. **Д)** акалічнасцю.

**16.** Вызначце правільна запісаныя словы:
*1) карняплод; 2) караблеваджэнне; 3) ільновалакно; 4) кінопракат.*
**А)** усе прыклады. **Б)** няма патрэбных варыянтаў. **В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

**17.** У якім сказе з дадзеных часціца ***не*** са словам пішацца асобна?
*1. (Не)дачытаная кніга ўсё роўна што (не)закончаны шлях.*
*2. З (не)забітага ліса футра не пашыеш.*
*3. На лбе ні ў кога (не)напісана, які ён.*
**А)** ва ўсіх сказах. **Б)** няма патрэбнага сказа. **В)** 1. **Г)** 2. **Д)** 3.

**18.** Вызначце тып аднасастаўнага сказа:
*Галінкі бэзу і язміну прыносяць з бліжняга сяла.*
**А)** назыўны. **Б)** пэўна-асабовы. **В)** няпэўна-асабовы.
**Г)** абагульнена-асабовы. **Д)** безасабовы.

**19.** У якім сказе з дадзеных правільна пастаўлены знакі прыпынку?
*1. Мы ні свет, ні зара паўставалі і хутчэй пачалі збірацца на рыбалку.*
*2. Хочаш не хочаш, а быць уважлівым трэба заўсёды.*
*3. У лесе мы бачылі, як маленькі, калючы вожык перабягаў сцяжынку.*
**А)** ва ўсіх сказах. **Б)** няма патрэбных прыкладаў. **В)** 1. **Г)** 2. **Д)** 3.

**20.** У перакладзе з рускай мовы слова ***ситец*** – … .
**А)** капрон. **Б)** аксаміт. **В)** паркаль. **Г)** сацін. **Д)** сукно.

**21.** Выберыце словы з дадзеных, якія пішуцца разам:
*1) (вечна)зялёны;*
*2) (сельска)гаспадарчы;*
*3) (гаркавата)кіслы.*
**А)** усе прыклады. **Б)** няма патрэбных прыкладаў. **В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 3.

**22.** Якія прыналежныя прыметнікі запісаны правільна?
*1) Валодзін; 2) Мішын; 3) мядзведзеў; 4) ластаўчын.*
**А)** усе прыклады. **Б)** няма патрэбных прыкладаў. **В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.